77206

# РАЗДЗЕЛ II.

# ДЗІЦЯ І СЯМ'Я

## Артыкул 12. Права на пражыванне ў сям'і

Кожнае дзіця мае права жыць у сям'і, ведаць абаіх сваіх бацькоў, права на іх клопат, на сумеснае з імі пражыванне, за выключэннем выпадкаў, калі разлучэнне з адным або абаімі бацькамі неабходна ў інтарэсах дзіцяці.

Права выбару аднаго з бацькоў для сумеснага пражывання дається дзіцяці па дасягненні ім 10-гадовага ўзросту.

## Артыкул 13. Права дзяцей, якія пражываюць асобна ад бацькоў

Дзіця, якое пражывае асобна ад аднаго або абаіх бацькоў у Рэспубліцы Беларусь ці ў любой іншай краіне, мае права на падтрыманне рэгулярных асабістых адносін і прамых кантактаў з бацькамі, калі гэта не наносіць шкоды яго жыццю і выхаванню.

## Артыкул 14. Адказнасць сям'і за дзіця

Бацькі і асобы, якія іх замяняюць, павінны ствараць неабходныя ўмовы для паўнацэннага развіцця, выхавання, адукацыі, умацавання здароўя дзіцяці і падрыхтоўкі яго да самастойнага жыцця ў сям'і і грамадстве.

Пры ўладкаванні дзіцяці ў апякунскую (прыёмную) сям'ю, дзіцячы дом, у тым ліку сямейнага тыпу, або школу-інтэрнат, іншую навучальна-выхаваўчую ўстанову на дзяржаўнае забеспячэнне бацькі пакрываюць расходы на яго ўтрыманне ў парадку, вызначаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Парушэнне правоў і ўшчамленне законных інтарэсаў дзіцяці бацькамі або асобамі, на утрыманні якіх яно знаходзіцца, цягне адказнасць, прадугледжаную заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

За парушэнне дзецьмі заканадаўства Рэспублікі Беларусь бацькі або асобы, якія іх замяняюць, нясуць адказнасць у адпаведнасці з нормамі грамадзянскага і іншага заканадаўства.

## Артыкул 15. Права на жыллё

Дзеці — члены сям'і наймальніка або ўласніка жылога памяшкання незалежна ад месца іх пражывання маюць права на жылое памяшканне, якое займаецца наймальнікам або ўласнікам.

Дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, уладкаваныя ў апякунскую (прыёмную) сям'ю, дзіцячы дом, у тым ліку сямейнага тыпу, або школу-інтэрнат, іншыя навучальна-выхаваўчыя ўстановы на дзяржаўнае забеспячэнне, маюць права на жылую плошчу, на якой яны пражывалі раней, або на атрыманне жылля ў нечарговым парадку ў адпаведнасці з жыллёвым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Пры разглядзе справы аб праве на жылую плошчу прадстаўнікамі дзіцяці ў судзе і іншых органах з'яўляюцца бацькі-выхавальнікі апякунскай (прыёмнай) сям'і, дзіцячага дома сямейнага тыпу, адміністрацыя дзіцячай інтэрнацкай установы, дзяржаўныя органы аховы дзяцінства.

## Артыкул 16. Права на маёмасць

Кожнае дзіця, у тым ліку і ўсыноўленае, незалежна ад месца пражывання мае права на атрыманне ў спадчыну маёмасці бацькоў у выпадку іх смерці або прызнання рашэннем суда памёршымі.

У выпадку прызнання бацькоў або аднаго з іх рашэннем суда адсутнымі без вестак дзіця мае права на ўтрыманне за кошт іх сродкаў і маёмасці ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## Артыкул 17. Абарона сям'і дзяржавай

З мэтай паўнацэннага ўтрымання і выхавання дзяцей у сям'і дзяржава забяспечвае выплату дапамог у сувязі з нараджэннем дзіцяці і на яго ўтрыманне да пэўнага ўзросту, выдае іншыя віды дапамог, гарантуе права на карыстанне пры неабходнасці дашкольнай установай і прадастаўляе льготы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ